ДОБРЫ ВЕЧАР

Добрый вечер

1995
ЛІПЕНЬ
11
АЎТОРАК
№ 101/1030
Цана 400 рублёў

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА

СТАЛІЧНАЯ ХРОНІКА

ПА ПАВЕДАМЛЕННЯХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ «ДВ», АГЕНЦТВАЎ РІД, БЕЛАПАН, БЕЛІНФАРМ

ТЭЛЕФОН — НЕ РАСКОША, А СРОДАК СУВЯЗІ

Гэта, безумоўна, стане непрыемнай навіной для аматараў (а ў асноўным — аматарак) працяглых тэлефонных размоў. Але факт застаецца фактам — да канца бягучага года ва ўсіх мінскіх кватэрах плануецца паставіць спецыяльныя апараты, якія фіксуюць час тэлефонных перагавораў. І тады апроч звычайнай абанементнай платы нам прыйдзецца дадаткова плаціць за кожную хвіліну размовы.

Першымі «ахвярамі» новаўвядзення сталі жыхары мікрараёна Уручча. З першага ліпеня, акрамя абанементнай платы, якая складае пакуль 8 тысяч рублёў, яны вымушаны выкладаць па 20 рублёў за кожную хвіліну перагавораў. А з дзесятага ліпеня запланаваны наступныя расцэнкі: абанементная плата — 10 тысяч рублёў, хвіліна размовы — 30 рублёў.

Казаць аб якімсьці эфекце такой сістэмы пакуль яшчэ рана. Шмат грошай было патрачана на набыццё неабходнай апаратуры і невядома, калі яна зможа акупіць сябе. Можна нават сказаць, што Мінская гарадская тэлефонная сетка, якая з'яўляецца гасразліковым прадпрыемствам, рызыкуе, адважыўшыся на такі эксперымент. Дапамогі ад дзяржавы МГТС не атрымлівае. А што, калі большасць людзей адмовіцца канчаткова спусташаць і без таго худыя кашалькі? Усім жа тэлефоны не адключыш...

Ігар АНДРЭЙЧАНКА.

«ДЗЕЦІ ПРАЎДЫ» ПРАДСТАЮЦЬ ПЕРАД СУДОМ

5 ліпеня народны суд Першамайскага раёна Мінска пачаў разгляд справы па іскавай заяве аб абароне гонару і годнасці дэпутата Вярхоўнага Савета З.Пазьняка. У якасці адказчыкаў выступалі кінарэжысёр Ю.Азаронак і Белдзяржтэлерадыёкампанія.

Як вядома, фільм Юрыя Азаронка «Нянавісць: дзеці маны» быў двойчы паказаны па беларускім тэлебачанні напярэдадні выбараў у Вярхоўны Савет. На судзе высветлілася, што Азаронак зняў гэтую карціну пасля заключэння папярэдняй дамоўленасці аб ёй з прыватным прадпрыемствам «Шэнка». Суд вырашыў прыцягнуць у якасці адказчыка і прадпрыемства «Шэнка». Аднак, паколькі яго кіраўніцтва ў дзень пасяджэння адшукаць не ўдалося, суд перанесены на 5 верасня бягучага года.

Валянцін ЗАНЕЎСКІ.

СПОРЫ ВОЗЛЕ КАССЫ

На протяжении нескольких дней, начиная с понедельника, в Минске на большинстве коммерческих киосков красовалась надпись «Закрыто». Оказывается, с 1 июля все подобные торговые точки должны быть оборудованы кассовыми аппаратами.

Как стало известно, задержка в «перевооружении» «комков» была вызвана отчасти несовершенством соответствующего постановления о порядке применения кассовых аппаратов в предприятиях розничной торговли и, в частности, внесенными в него изменениями. Так, последними предусматривалось установить только в системе потребительской кооперации за один месяц кассовые аппараты более чем в 11 тыс. магазинов, на что необходимо затратить более 60 млрд. рублей (и это в условиях убыточности торговли на селе). Кроме того, в результате принятых изменений, теперь необходимо выдавать отрывной талон при реализации, к примеру, кваса из квасной емкости, овощей и фруктов с лотка, а в магазинах в отдаленной сельской местности при реализации таких товаров, как спички, булавки и т.д. По мнению специалистов Министерства торговли (не участвовавших в принятии последних изменений в постановлении о порядке применения кассовых аппаратов в предприятиях розничной торговли), экономической целесообразности в таком решении нет, поскольку существовавший ранее порядок учета на отдельных объектах торговли по накладным, зарегистрированным в налоговых органах, также позволял взимать налоги. Дополнительное введение отрывных талонов увеличит издержки обращения, что может повлечь рост цен. Кроме того, терминология, примененная в утвержденном «Перечне стационарных торговых пунктов», не соответствует общепринятой, что вызывает многочисленные запросы от исполкомов и субъектов хозяйствования.

Сергей РАСОЛЬКО.

КІРЫЛ ЛАЎРОЎ: «НАШ САЮЗ БУДЗЕ ПЛЁННЫМ»

У Мінску адбылася прэс-канферэнцыя прадстаўнікоў Савета па культурным супрацоўніцтве (СКС) краін-удзельніц СНД. Першы намеснік міністра культуры Беларусі Уладзімір Гілеп, які абраны старшынёй СКС, азнаёміў прысутных з рашэннямі першай арганізацыйнай нарады Савета, якая толькі што завяршылася. На ёй прысутнічалі прадстаўнікі 11 краін СНД. Згодна з рэкамендацыяй нарады кіраўнікоў урадаў, дзеячы культуры і паўнамоцныя прадстаўнікі дзяржаў распрацавалі палажэнне аб Савеце, намецілі накірункі яго дзейнасці. Ул.Гілеп адзначыў вялікую ролю ў арганізацыі СКС яго ініцыятараў — прэзідэнта Міжнароднай канфедэрацыі тэатральных саюзаў Кірыла Лаўрова і прэзідэнта Беларускай канфедэрацыі творчых саюзаў і культурных фондаў Мікалая Яроменкі. Кірыл Лаўроў сказаў: «У Расіі ў Міністэрстве культуры адбыліся такія кадравыя перамяшчэнні, аб якіх раней мы не маглі і марыць. Раней культурай мог кіраваць, хто хацеў. Цяпер цудоўна тое, што Міністэрства культуры складаецца з прафесіяналаў, якія ўсё сваё жыццё звязалі з культурай. З імі лёгка знайсці агульную мову. Усё гэта ўсяляе ў мяне ўпэўненасць, што і наш саюз будзе плённым». Старшыня СКС адносна стварэння новага міждзяржаўнага органа выказаўся вельмі вобразна: «Калі доўгі час сядзіш у цёмным пакоі і потым выходзіш на святло, узнікае радаснае пачуццё. Менавіта гэтае пачуццё мы зведалі пасля двух дзён пасяджэнняў: мы раптам убачылі святло. Мы ўбачылі адзін аднаго, нагаварыліся, выгаварыліся. І хтосьці з нас сказаў у перапынку пасяджэння: «Сённяшні дзень стаў для нас светлым днём. Мы ўсвядомілі свае праблемы. У нас з'явілася надзея, што мы прарвёмся з цёмнага пакоя да святла». У прэс-канферэнцыі таксама ўзялі ўдзел прэзідэнт Міжнароднай канфедэрацыі саюзаў мастакоў Валянцін Сідараў і намеснік старшыні СКС, першы намеснік міністра культуры Грузіі Мая Кабахідзе.

Уладзімір ТРАЦЦЯКОЎ.

КУРС ОБМЕНА наличной валюты в коммерческих банках на 11 июля 1995 г.

Наименование банка	Доллар США		Немецкая марка		Российский рубль	
	покупка	продажа	покупка	продажа	покупка	продажа
БЕЛАРУСБАНК	11200*	11450*	8000*	8250*	1.80*	2.50*
БЕЛБИЗНЕСБАНК (гл. оп. упр.)	11250	11550	7850	8250	2.1	2.5
ФК "ВЕРОНИКА" ***	11250	11480	8040	8300	2.32	2.45
НАРОДНЫЙ БАНК	11230	11450	8000	8200	2.28	2.38
ПРИОРБАНК	11200	11500	7800	8300	2.1	2.3
СБЕРБАНК	11200 11400**	11450 11700**	7800 8150**	8100 8500**	2.0*	2.4*
ОЛИМП	11270*	11450*	7990*	8283*	2.25*	2.4 2.48**
Ф-л МИЛАВИЦА АКБ ДУКАТ	11200*	11500*	7800	8200	2.1	2.5
БЕЛБИЗНЕСБАНК (гор. дирекция)	11300	11500	8000	8300	2.2	2.5
ИНТЕК	11200	11500	7900	8200	2.2	2.5
ДУКАТ	11250	11550	7900	8250	2.2	2.70**
МинскКОМПЛЕКСБАНК	информация на 9.50 не получена					
ЭЛИТБАНК	11200	11500	7800	8300	1.9	2.45
Ф-л НЕМИГА АКБ ДУКАТ	информация на 9.50 не получена					
Филиал №1 АКБ ОЛИМП	11280	11450	7800	8150	2.1	2.35
БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК	11000	11600	7960	8390	2	2.6
БЕЛИНВЕСТБАНК	11200	11500	7700	8300	2	2.5

■ * Возможна операция за наличный и безналичный расчет

■ ** Операция проводится только по безналичному расчету

■ В течение дня курсы могут меняться, курсы головного управления банков могут несущественно отличаться от курсов, установленных в обменных пунктах.

■ Информация (на 9 час. 45 мин.) подготовлена "Агентством Грецова".

НАЦИОНАЛЬНЫЙ БАНК (официальный курс для б\н расчетов)	11500	8319.47	2.48

□ КОРОТКО

***

Белорусский общественный Фонд развития «Гражданская солидарность» проводит 15 июля в столичном ресторане «Константин» вечер-марафон звезд эстрады.

Все средства от продажи билетов пойдут на благотворительную помощь социально незащищенным слоям населения. В марафоне примут участие Вадим Касенко, Светлана Ханок, шоу-балет «Орхидея», а также многие другие артисты и музыкальные коллективы.

***

14–16 июля под Минском в Вязынке пройдет I Всебелорусский турслет «Мама, папа, я — туристская семья». Открытие слета — утром 15 июля. В программе: спортивное ориентирование, полоса препятствий, семейная эстафета, велоралли, различные конкурсы. В слете примут участие молодежный турклуб «Пилигрим», столичные детско-юношеский клуб «Эдельвейс», студенческий «Эхо» и другие туристские объединения. Проводят этот слет Республиканский учебно-методический Центр физического воспитания и Школа оздоровления «Оптималист».

ФОТОФАКТ

Более четырехсот студентов Белгосуниверситета, окончивших военную кафедру, приняли присягу на верность Республике Беларусь. Всем им присвоено звание лейтенанта запаса.

НА СНИМКЕ: студенты Белгосуниверситета — будущие офицеры запаса — присягают на верность Республике Беларусь.

Фото Виктора ТОЛОЧКО, БЕЛИНФОРМ.

ЗАЯВА КІРАЎНІЦТВА ФЕДЭРАЦЫІ ПРАФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ АБ НЕДАПУШЧАЛЬНЫМ ПАВЫШЭННІ ТАРЫФАЎ

Урад парушае Генеральнае пагадненне на 1995 год, якое вызначае ўзаемасувязь паміж узроўнем цэн, памерам аплаты працы, пенсій, стыпендый і гэтак далей, гаворыцца ў адпаведнай заяве кіраўніцтва ФПБ. Таксама адзначаецца, што, улічваючы цяжкае фінансавае становішча большасці прадпрыемстваў, павелічэнне заробку магчыма толькі аднačасова са зніжэннем падаткаў на гаспадарчую дзейнасць і даходы грамадзян, тарыфаў на спажываемыя прамысловасцю энерганосьбіты. Толькі такое — усебаковае і комплекснае — вырашэнне праблемы, на думку прафсаюзаў, дапаможа пазбегнуць паглыблення крызісу ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы, росту запазычанасці грамадзян па кватрплаце і камунальных паслугах.

Ірына ЛЕЎШЫНА.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

НА ЗЯЛЁНЫМ СУКНЕ КАЗІНО...

Тамара МАРКІНА, «ДВ».

Вось дзе ладзіць свята фартуна, дык у казіно! Тут ужо, як фарціць, дык фарціць, а як не, дык па-зялёнаму — не! Ці кліенту з грашыма, які надта хоча выпрабаваць свой лёс. Ці, наадварот, — казіно. Часцей, зразумела, шанцуе фірме, бо інакш казіно разарылася б.

Тым не менш усе наведвальнікі казіно ідуць дамоў хаця і без грошай, але, як зазначыў генеральны дырэктар АТ «Белатракцыён» Аляксандр Калінін, надта задаволеныя. Непрадказальная справа — азарт.

А сустрэліся мы са спадаром Калініным на прэс-канферэнцыі членаў праўлення нованароджанай Беларускай асацыяцыі актыўных гульняў і латэрэй. Акрамя яго ў ёй прынялі ўдзел дырэктар НВА паліграфіі каштовых папер «НПМ» Аляксандр Хоміч, генеральны дырэктар ЗАТ «Еўралато» Ігар Патапенка, дырэктар брокерскай букмекерскай фірмы «Плюс мінус» Аляксандр Шэльмакоў, генеральны дырэктар ВК ТАА «Данькаў-Клуб» Юрый Шыцік — гаспадар офіса, дзе і праходзіла прэс-канферэнцыя, — і іншыя спадары ад асацыяцыі актыўных гульняў і латарэй.

Размова на прэс-канферэнцыі ішла аб стварэнні вышэйназванай асацыяцыі, якая дапаможа існаваць казіно і іншым забаўляльным прадпрыемствам. Перш-наперш члены праўлення асацыяцыі пажаліліся на падатковыя інспекцыі раённага і рэспубліканскага ўзроўняў. Інспекцыі выставілі шэрагу забаўляльных прадпрыемстваў Мінска, як лічаць ініцыятары прэс-канферэнцыі, неабгрунтаваныя мільярдныя штрафныя санкцыі з-за невыплачанага падаходнага падатку з грамадзян пры выдачы грашовых сум у залах гульнявых аўтаматаў і казіно. Найбольш буйныя фінансавыя санкцыі былі прад'яўлены СП «Адмірал» і «Белатракцыёну». Прадстаўнікі асацыяцыі не згодныя з патрабаваннямі інспекцый. Іх выкананне можа стаць прычынай банкруцтва забаўляльных прадпрыемстваў. А гэта каля 30 казіно і 200 залаў з гульнявымі аўтаматамі. Дарэчы, прадпрыемствы гэтага віду працавалі дагэтуль прыбытковa і спраўна папаўнялі дзяржаўную казну, не забываючы, зразумела, пра сябе. (Аказваецца, у нас нямала заможных людзей, якія даюць шанс расцвісці забаўляльнай індустрыі.)

Сёння гульнявы бізнес уяўляе сабой 2,5 тысячы рабочых месцаў — нямала нашых суайчыннікаў знайшлі сябе ў ролях круп'е, афіцыянтаў, ахоўнікаў забаўляльных фірм.

З усяе купы забаўляльных адгалінаванняў бліжэй да народа будуць, мусіць, найбольш масавыя гульні ў лато, спрынт, латэрэю. Сродкі ад іх найчасцей накіроўваюцца на добрыя справы — развіццё спорту, культуры і г.д. Мусіць, патрэбны пэўным сацыяльным слаям, якія маюць «лішнія» грошы, і рулетка, і бінга, і покер. Застаецца толькі наладзіць адносіны з падатковай інспекцыяй. А гэта справа часу, бо ўзаемаадносіны прадпрыемстваў тыпу «казіно» з дзяржавай у іншых краінах устаноўлены на патрэбных, задавальняючых абодва бакі, умовах. Усталюецца ўсё і ў нас.

Што цікава: мэтай № 1 асацыяцыя актыўных гульняў і латэрэй лічыць прапаганду адраджэння традыцый міласэрнасці, мецэнацтва, сцвярджэння гуманістычных ідэалаў. Мэта добрая, высокая, але калі я запыталася пасля прэс-канферэнцыі ў аднаго з кіраўнікоў асацыяцыі, ці можна накіроўваць да іх людзей, дзецям якіх патрэбна нятаннае лячэнне за мяжой, той адказаў адмоўна. Застаецца спадзявацца, што пасля вычарпання канфлікту з падатковай інспекцыяй гульнявы бізнес стане больш міласэрным не да ўсіх наогул, а для канкрэтнага чалавека ў бядзе. Інакш нельга, бо адвернецца фартуна.

СЛУЖБА «01»

МАЛА ИСКРА, ДА БЕДА ОТ НЕЕ ВЕЛИКА

С.ПАЛАНЕВИЧ, инспектор ОВПС Московского района г.Минска.

Небрежно брошенные непотушенная спичка, окурок сигареты... У некоторых людей настолько прочно укоренилась такая привычка, что они даже не замечают за собой этого недостатка. Но так ли безобидны на самом деле непотушенная спичка или сигарета? К сожалению, жизнь убедительно доказывает, что неосторожность с огнем во время курения зачастую приводит к пожарам, нередко — к гибели людей.

Большинство пожаров по вине тех, кто пренебрегает правилами безопасности при курении, происходит в домах граждан. Вот цифры статистики, которые не нуждаются в комментариях. За этот год в Минске в пожарах погиб 31 человек, из них 4 детей, травмировано 11 человек.

Из-за неосторожного обращения с огнем в состоянии алкогольного опьянения произошел пожар по ул.Казинца, 43. В результате погиб хозяин квартиры.

Часто несчастные случаи со смертельным исходом происходят даже при небольших размерах пожара. Причина кроется в том, что в современных квартирах значительная часть предметов — из синтетических материалов. Вещества, выделяемые при их горении, высокотоксичны, что и приводит к отравлению.

Народная мудрость гласит: «Мала искра, да беда от нее велика». И чтобы не случилось этой беды, нужно всегда быть осторожным с огнем.

ФІНАНСЫ

ФІРМЫ-ШПІЁНЫ

У рэспубліцы існуюць прыватныя фірмы, якія здольны на працягу некалькіх гадзін даць вычарпальную інфармацыю аб фінансавым становішчы партнёраў па здзелках, іх рэпутацыі ў дзелавым свеце, уключаючы падрабязнасці з прыватнага жыцця супрацоўнікаў. Каштуе гэта не вельмі дорага: 200 долараў — аб суб'ектах гаспадарання ў Еўрапейскім рэгіёне; 300 — па амерыканскім і арабскім кантынентах. Аб гэтым заявіў на нядаўняй калегіі пракуратуры рэспублікі начальнік упраўлення агульнага нагляду Міхаіл Снягір, дадаўшы, што не ведае ніводнай дзяржаўнай структуры, здольнай прадаставіць падобную інфармацыю. А між іншым, няўменне вывучыць партнёра, упэўніцца ў яго «добранадзейнасці» ператварылася ў сур'ёзную дзяржаўную праблему, якая выліваецца ў шматмільённыя страты. Прыклад гэтаму — «накладка» пры продажы тысячы тон жоўтага фосфару «Белміжкамсервісам» нейкай швейцарскай фірме. Цяпер «Белміжкамсервіс» не можа спагнаць з даўжніка ні сыравіну, ні грошы. Швейцарскія бізнесмены, у адрозненне ад нашых, такім чынам склалі дагавор, што цяпер беларускаму прадпрыемству трэба даказваць сваю праваты ў лонданскім судзе. А там памер дзяржпошліны даходзіць да 50 працэнтаў ад кошту здзелкі. А калі дадаць кошт судовых выдаткаў, камандзіровачныя расходы ў Лондан і адтуль... Зразумела, што справа таго ўжо не вартая...

Святлана ЮЗІК, БелаПАН.

ПАМЯТНЫЯ ДАТЫ

11 ЛІПЕНЯ — МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ НАРОДАНАСЕЛЬНІЦТВА

Увесь свет у гэтым годзе ў чарговы раз адзначае Міжнародны дзень народанасельніцтва.

У мінулым годзе Рэспубліка Беларусь упершыню прыняла ўдзел у Міжнароднай канферэнцыі па народанасельніцтву і развіццю ў Каіры, на якой была прынята Праграма дзеянняў, накіраваная на задавальненне запатрабаванняў людзей у сферы адукацыі і аховы здароўя, на паляпшэнне становішча жанчын у грамадстве.

У мэтах правядзення больш актыўнай дэмаграфічнай палітыкі Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь стварыў Нацыянальны камітэт па народанасельніцтву, які ўзначаліў намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Русакевіч. Намеснікам старшыні Камітэта з'яўляецца міністр працы Аляксандр Сасноў. У састаў камітэта ўвайшлі адказныя работнікі апарату Кабінета Міністраў, намеснікі міністраў шэрага міністэрстваў, вядучыя вучоныя Беларусі.

На першым пасяджэнні Нацыянальнага камітэта па народанасельніцтву заслухана і абмеркавана інфармацыя аб дэмаграфічнай сітуацыі, якая склалася ў рэспубліцы, разгледжаны праект Канцэпцыі дзяржаўнай дэмаграфічнай палітыкі і зацверджаны перспектыўны план яго дзейнасці.

Прэс-служба Кабінета Міністраў.

ЧЫГУНКА РЫХТУЕЦЦА ДА 125-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ

Сто дваццаць пяць гадоў таму была ўведзена ў эксплуатацыю чыгуначная лінія Смаленск — Мінск — Брэст. З гэтага дня і вядзецца летазлічэнне Беларускай чыгункі, якая налічвае сёння 5,5 тысячы кіламетраў галоўных пуцей. За гэтыя дзесяцігоддзі на чыгунцы з'явілася шмат працоўных дынастый, а сама яна стала «дзяржавай у дзяржаве», якая нават ва ўмовах цяперашняга эканамічнага крызісу не толькі забяспечвае стабільны ўзровень перавозак, але і мадэрнізуецца, будуе, рыхтуе новую змену чыгуначнікаў. Ва ўпраўленні чыгункі створана камісія па падрыхтоўцы да святкавання юбілейнай даты. Плануецца ўшанаванне ветэранаў магістралі, адкрыццё новых музейных экспазіцый, абнаўленне памятных мясцін, звязаных з гісторыяй Беларускай чыгункі, выпуск памятных значкоў, паштовак і святочных буклетаў.

Святлана ЮЗІК, БелаПАН.

АДЗНАЧЫЦЬ ДЗЕСЯТУЮ ГАДАВІНУ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ КАТАСТРОФЫ

Доктар Штробл знаходзіцца ў Беларусі па запрашэнні Беларускага дабрачыннага фонду «Дзецям Чарнобыля». Ён узначальвае адну з ЮНЕСКА-школ — арганізацыю, якіх зараз шмат у шэрагу еўрапейскіх краін. У дзень 26 красавіка ўсе ЮНЕСКА-школы, якія пажадалі ўдзельнічаць у праекце, правядуць збор сродкаў для насельніцтва абласцей, што пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы, абмяркуюць на сваіх занятках праблемы энергетычнай палітыкі і аховы навакольнага асяроддзя. «У тым, што такая акцыя адбудзецца, у мяне няма ніякіх сумненняў, — заявіў доктар Штробл. — Недапушчальна, каб у «еўрапейскім доме» людзі былі пакінуты на волю лёсу. І хаця мы ведаем, што многія арганізацыі Беларусі выконваюць вялікую работу па дапамозе чарнобыльцам, мы мяркуем, што ўплыў міжнароднай грамадскасці таксама будзе карысным».

Уладзімір ГЛОД, БелаПАН.

ПА ПРАБЛЕМАХ ЗАМЕЖНЫХ ІНВЕСТЫЦЫЙ

Як паведамілі ва ўпраўленні міжнароднага супрацоўніцтва і інфармацыйнага забеспячэння Міністэрства па кіраванні дзяржаўнай маёмасцю і прыватызацыі, Міндзяржмаёмасць сумесна з міжнароднай кансалтынгавай фірмай «Куперс і Лайбранд» праводзіць 12 ліпеня семінар «Роля дзяржавы ў стварэнні спрыяльных умоў для прыцягнення замежных інвестараў у перыяд рэфарміравання эканомікі». У рамках семінара пройдзе абмеркаванне праекта стварэння Агенцтва па прыцягненні замежных інвестыцый у Рэспубліку Беларусь. На семінар запрошаны прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, урада, МЗС, Мінзнешэкаамсувязі, банкаўскіх і дзелавых колаў.

Ірына САЗАНОВІЧ, БелаПАН.

Газете «Добры вечар» требуются на работу операторы компьютерного набора.

Телефон для справок: 68-28-04.

СОТРУДНИЧЕСТВО

"ХОТИМ ДАРИТЬ ЛЮДЯМ НАДЕЖДУ..."

Международная гуманитарная ассоциация "Наше будущее" была зарегистрирована в апреле этого года, но работа началась значительно раньше. Цели и задачи ее деятельности заключаются в содействии социально-экономической реформе и создании демократического правового государства в Республике Беларусь. Ассоциация придает большое значение развитию международного сотрудничества молодежных и иных организаций, реализации социально значимых инициатив в республике, оказанию помощи системам здравоохранения и образования республики, а также непосредственно гражданам Республики Беларусь, пострадавшим от аварии на Чернобыльской АЭС, катастроф, межнациональных конфликтов, войн и иных стихийных бедствий. В числе ее учредителей — преподаватели, врачи, юристы, бизнесмены. В будущем организация будет работать на всю республику, а пока — только в Минске.

О деятельности ассоциации "Наше будущее" наш внештатный корреспондент Кира ШУМАНСКАЯ говорит с ее президентом Стеллой Харлампиевной СЕРЕБРЯКОВОЙ.

— Прежде всего мы будем уделять внимание детям, их отдыху, здоровью, образованию. В наших планах — открытие международного гуманитарного лицея. Хотим также осуществить медицинские и некоторые другие проекты.

Мы заключили такие контракты с общественными организациями США, Бельгии, Франции, Польши и др. В этих странах много людей, искренне желающих помочь нашей республике. Однако они мало информированы, не знают, кто и в чем нуждается в первую очередь, не знают, как это сделать. Для иностранцев в то же время важно, кто, какие организации здесь, в Беларуси, с ними сотрудничают. Наша ассоциация оказывает им в этом содействие. Еще помогает и то, что в нашей ассоциации — преподаватели, выпускники и студенты лингвистического университета. Можно считать, что лингвистический университет является нашей базой.

Мы устанавливаем и развиваем контакты с частными лицами и организациями в республике и за ее границами. Принимаем заявки от медицинских и других организаций. Фокусируем внимание на главных, на наш взгляд, проблемах.

—А они сами о них не знают?

— В том-то и дело, что знают далеко не всегда. Они часто, например, недооценивают влияние Чернобыля. После беседы с врачами-специалистами, посещения дома ребенка, где живут больные дети, они начинают по-другому воспринимать эту проблему.

— Но ведь регулярно направляя сюда помощь, иностранцы, видимо, преследуют и свои цели...

— Существует мнение, что гуманитарная помощь — это разведка рынка. Когда население привыкает к этим товарам, начинается торговля ими. Но давайте подумаем, сколько детей и взрослых остались в живых, вовремя получив необходимые лекарства. Поэтому, я уверена, нужно сказать большое спасибо тем, кто помогает Беларуси. Но на мой взгляд, мы и сами должны пытаться более самостоятельно решать эти проблемы.

Тем более, что их у нас в республике столько, что работы хватит всем.

КОММЕНТАРИЙ

БУДЕМ С ХЛЕБОМ

Как свидетельствуют статистические данные, в последнее время в Беларуси наблюдается снижение объемов производства хлебобулочных изделий. Комментирует ситуацию начальник главного управления технического развития хлебопекарной и макаронной промышленности Министерства хлебопродуктов Людмила ГОЛУБЕВА.

— Объединения хлебопекарной промышленности работают стабильно по суточным заявкам торговли, которые полностью выполняются, — сказала она. — Другими словами, мы производим хлебобулочных изделий ровно столько, сколько используется потребителями по прямому назначению, исключая скармливание домашнему скоту и птице. Среднедушевое потребление хлеба по стране составляет сейчас 265 г. на человека в сутки. В то же время существует ряд серьезных проблем, негативно влияющих на работу нашей отрасли. Прежде всего это трудности с обеспечением пшеничной мукой. Нет средств и для обновления оборудования в связи с низкой рентабельностью производства (нормативная всего лишь 10 процентов). К примеру, замена одной печи для производства хлубобулочных изделий обходится сейчас в 3-3,5 млрд. рублей, в то время как чистая прибыль одного из областных объединений хлебопекарной промышленности (7-12 заводов) за пять месяцев текущего года составила всего 3,5 млрд. рублей. А из 400 печей в целом по стране требуют замены 157 штук, или 42% от общего количества. Сказываются и низкая зарплата работников отрасли, тяжелый (круглосуточный) ее режим. Тем не менее, мы все время работали над расширением ассортимента из имеющегося сырья. Очевидно, многие уже попробовали такие сорта хлеба как "Новоберезинский", "Приднепровский", "Белорусский" с высоким содержанием пшеничной муки, булочные изделия и батоны с применением (впервые в истории хлебопечения) ржаной, овсяной муки, продукции из тритикале (гибрида ржи и пшеницы). Решаются и вопросы с нехваткой муки — как с помощью кредитов, так и посредством увеличения сельским хозяйством площадей под посевы пшеницы. Словом, будем с хлебом.

Сергей РАСОЛЬКО, РИД.

ДЫПЛАМАТЫЯ

У ЛЮКСЕМБУРГУ АКРЭДЫТАВАНЫ ПАСОЛ БЕЛАРУСІ

Пасол Рэспублікі Беларусь у Люксембургу Уладзімір Лабуноў уручыў свае даверныя лісты Вялікаму Герцагу Люксембургскаму Жану. Як паведамілі ў аддзеле друку і інфармацыі беларускага Міністэрства замежных спраў, у гутарках, якія адбыліся падчас аўдыенцыі ў Герцага і ў Міністэрстве замежных спраў Люксембурга, абмяркоўваліся перспектывы развіцця двухбаковых адносін. У прыватнасці, магчымасці падрыхтоўкі міжурадавых пагадненняў у галінах узаемнай абароны інвестыцый, устрыманне ад двайнога падаткаабкладання, аўтамабільных і паветраных перавозак. Уладзімір Лабуноў наведаў у Люксембургу Еўрапейскі інвестыцыйны банк і Суд Еўрапейскіх супольніцтваў. Ён атрымаў агульную інфармацыю пра гэтыя органы ЕС, а таксама абмеркаваў з прадстаўнікамі іх кіраўніцтва магчымасць супрацоўніцтва з нашай рэспублікай.

Юрый АЛЯКСЕЕЎ, БелаПАН.

АВИАЦИЯ

***

На Минском авиаремонтном заводе гражданской авиации отремонтирован и получил вторую жизнь самолет ЯК-42. До сих пор здесь ремонтировали только ЯК-40 и ТУ-134. После ремонта ЯК-42 совершил первый испытательный полет.

НА СНИМКАХ: Директор завода Аркадий Григорьевич Ямов (в центре) беседует с авиаремонтниками перед испытательным полетом.

Фото Геннадия СЕМЕНОВА, БЕЛИНФОРМ.

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

СУСТРЭЧА НА ЎРАДАВЫМ УЗРОЎНІ

У Мінску знаходзілася член польскага сейма, старшыня ўсяпольскага пагаднення прафсаюзаў Ева Спыхальска.

Пані Спыхальска сустрэлася з кіраўніцтвам і актывам Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Падчас сустрэчы абмяркоўваліся пытанні двухбаковага супрацоўніцтва паміж беларускімі і польскімі прафсаюзамі.

На прайшоўшай пасля перамоў прэс-канферэнцыі пані Спыхальска паведаміла, што яе візіт носіць чыста рабочы характар, а асноўная яго мэта — перадача вопыту польскіх прафсаюзаў беларускім калегам. Гэты вопыт, па словах Евы Спыхальскай, прадстаўляе асаблівае значэнне, калі ўлічыць, што Польшча, гэтак жа, як і Беларусь, перажывае нялёгкі працэс эканамічных пераўтварэнняў. Ва ўмовах эканамічнай нестабільнасці і пераўтварэнняў перад прафсаюзамі, якія б краіны яны ні прадстаўлялі, паўстаюць, у прынцыпе, аднолькавыя мэты: захаванне працоўных месцаў з мэтай прадухілення беспрацоўя; сацыяльная абарона працоўных; рэгуляванне заробку згодна з пражытачным узроўнем і гэтак далей.

Акрамя таго, як высветлілася, ва ўсяпольскага пагаднення прафсаюзаў і ў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ёсць нямала агульнага. Абедзве арганізацыі налічваюць звыш 4 мільёнаў чалавек, іх дзейнасць будуецца на падобных прынцыпах — асноўная работа праходзіць у галіновых прафсаюзах, цэнтр жа выконвае ролю каардынатара і арганізатара.

У гэты ж дзень пані Спыхальску прыняў беларускі прэм'ер-міністр Міхаіл Чыгір. Напярэдадні сустрэчы з М.Чыгіром яна паведаміла журналістам, што высока ацэньвае маючы адбыцца прыём на высокім узроўні, які цікавы ёй не толькі як прафсаюзнаму дзеячу, але і як члену польскага Сейма.

5 ліпеня пані Спыхальска плануе сустрэцца з работнікамі пасольства Рэспублікі Польшча ў Мінску, пасля чаго пакіне Беларусь.

Ірына ЛЕЎШЫНА, БелаПАН.

КАНТАКТЫ

ВІЗІТ ЭКСПЕРТАЎ З ІТАЛІІ

У Мінск з двухдзённым візітам прыбыла група экспертаў міністэрства транспарту Італіі.

Мэта візіту — абмеркаванне тэксту міжурадавага беларуска-італьянскага пагаднення «Аб міжнародных аўтамабільных зносінах». Беларускі бок на перамовах узначаліць намеснік міністра транспарту і камунікацый Васіль Чалоўскі. У ходзе перамоў плануецца абмеркаваць пытанні двухбаковых перавозак паміж дзяржавамі, вызначыць патрэбнасць у колькасці дазволаў на праезд транзітам, абумовіць арганізацыйныя і прававыя праблемы, якія ўзнікаюць у перавозчыкаў абедзвюх краін пры перасячэнні межаў, што тычацца, у прыватнасці, спрашчэння мытных працэдур, а таксама парадак спагнання падаткаў і збораў з транспарту.

Мяркуецца, што асаблівая ўвага на перамовах будзе нададзена пытанням адпаведнасці нашага транспарту нормам эканамічнай бяспекі, што прыняты ў Еўропе. Калі беларускі бок палічыць магчымым прыняць тэкст Пагаднення, прапанаваны італьянскім бокам, то дакумент будзе парафіраваны.

Святлана ЮЗІК.

АРМИЯ

ЗАВЕРШАЕТСЯ ВЫВОЗ РАКЕТНОГО ТОПЛИВА

Геннадий ХУДИНСКИЙ, пресс-служба Министерства обороны Республики Беларусь.

Как известно, в соответствии с договоренностями, большинство российских частей уже покинуло территорию Беларуси. Однако по ряду причин они не смогли сразу увезти все военно-техническое имущество, компоненты систем вооружений. Остались склады хранилища с опасным наследством. По сей день из страны не вывезено значительное количество ракетного горючего.

Специалисты Минобороны Беларуси неоднократно отмечали срывы графика работ по вывозу компонентного ракетного топлива, недостаточный контроль за его хранением. Об этом уведомлялось руководство российской армии.

В июне авторитетная комиссия России с участием белорусских представителей проверила российские военные объекты. Итогом этой проверки стал протокол совместной российско-белорусской комиссии, в котором определены меры по завершению вывоза компонентов.

Как сообщил начальник службы горючего тыла Вооруженных Сил Беларуси полковник Валентин Новов, в ближайшее время последний эшелон, последние цистерны с ракетным горючим должны покинуть белорусскую территорию. Принимаются все меры, чтобы ускорить эти работы, обеспечить их безопасность. Однако многое зависит от оперативных четких действий российской стороны, продуманных совместных решений.

На сегодняшний день уже подготовлен к отправке последний эшелон, находятся под погрузкой последние цистерны. Белорусская земля, пережившая Чернобыль, освобождается от ядовитых компонентов оружия, угрожающих безопасности людей и экологии страны.

ЛІТВА

ЧАС РОЎНАСЦІ — У МІНУЛЫМ...

Сёння з 29 афіцыйна зарэгістраваных камерцыйных банкаў у Літве працягваюць работу толькі 19. Дзейнасць дзесяці — абмежавана, яны знаходзяцца на мяжы банкруцтва.

У грамадстве існуе думка, што некаторыя банкі і ствараліся з арыентацыяй на будучае банкруцтва. У выніку такой сітуацыі нядрэнна зарабілі іх спрытныя заснавальнікі, банкаўскія чыноўнікі і блізкія,ім кліенты, якія атрымалі крэдыты на Бог ведае якія патрэбы і пад якія гарантыі. Пацярпелі ад гэтага ў першую чаргу радавыя ўкладчыкі і прадпрыемствы. За бескантрольнасць і безадказнасць у адносінах да банкаў сродкі масавай інфармацыі крытыкуюць улады. Гэта прымусіла іх павярнуцца тварам да праблемы, якая абяцае не толькі эканамічныя, але і палітычныя негатыўныя вынікі.

Асаблівы клопат урад Літвы праявіў аб камерцыйным банку «Аўрабанкас», таму што ў ім свае грошы захоўвалі многія бюджэтныя арганізацыі. Каб выратаваць свае ўстановы, прынята рашэнне выкупіць кантрольны пакет акцый гэтага банка за кошт дзяржбюджэту, а адносна так званых «ненадзейных крэдытаў» узбудзіць крымінальныя справы. Дзявацца не было куды — такія крэдыты ў гэтым банку складаюць звыш 60 мільёнаў літаў.

Сітуацыя ў камерцыйных банках абмяркоўвалася і на фракцыі большасці ў Сейме Літвы. Прынята рашэнне пачаць распрацоўку праекта закона аб страхаванні ўкладаў грамадзян і аб стварэнні міжбанкаўскага фонду ўзаемадапамогі. Аднак, як адзначаюць некаторыя эксперты, такія законы прыняць будзе цяжка, таму што буйнейшыя камерцыйныя банкі не схільныя частку сваіх сродкаў накіроўваць на выратаванне сваіх калег. Паводле слоў прэзідэнта асацыяцыі камерцыйных банкаў Літвы Эдуардаса Вілкяліса, Літва — не краіна фінансавага транзіту, ёй не трэба, як у Даніі, 177 банкаў, дастаткова 6-8. За людзей, якія страцілі свае зберажэнні, былы міністр урада, відаць, не перажывае. Нядаўна ён заявіў: «Няма чаго баяцца расслаення людзей на багатых, асоб з сярэднім дастаткам і тых, хто жыве за мяжой беднасці. Час роўнасці адышоў у мінулае».

Толькі вось узнікае пытанне — а ці не за кошт тых, хто аказваецца за мяжой беднасці ў выніку безадказнасці таго ж самага міністэрства фінансаў, з'яўляюцца багатыя? І што будзе, калі следства раскрые (калі яго не падкупяць), што «ненадзейныя крэдыты» на самай справе злачынныя? Няўжо і за гэта зноў будуць адказваць толькі стрэлачнікі? Грамадства ўсе ж яшчэ спадзяецца на праўдзівы адказ, хоць цалкам усведамляе, што на самай справе час роўнасці адышоў у мінулае.

АДНОЙ ПАМЯТНАЙ ДАТАЙ СТАЛА БОЛЬШ

У азнаменаванне другой гадавіны вываду апошняга падраздзялення расійскіх войск з тэрыторыі Літвы Сейм рэспублікі прыняў рашэнне аб'явіць 31 жніўня памятнай датай — Днём вызвалення.

Як вядома, апошні эшалон з маёмасцю расійскай арміі пакінуў Літву 31 жніўня 1993 года. Такім чынам было завершана выкананне графіка вываду расійскіх войск з рэспублікі, зацверджанага ў 1992 годзе міністрам аховы края Літвы і міністрам абароны Расіі.

ЗА КРАТАМІ — У ДАМАШНІМ ХАЛАЦЕ

Цяпер зняволеныя шэрагу літоўскіх калоній змогуць адбываць пакаранне ў цывільным адзенні і насіць свой абутак. Такое рашэнне прыняў Сейм Літвы, які дазволіў у якасці эксперыменту насіць цывільнае адзенне ў Панявежскай жаночай калоніі агульнага рэжыму, Правенішцкай калоніі ўзмоцненага рэжыму і папраўча-працоўнай калоніі строгага рэжыму ў Марыямпалі.

Адзенне і абутак зняволеныя атрымаюць у пасылках ад блізкіх або змогуць набыць у магазінах, размешчаных на тэрыторыі гэтых папраўчых устаноў. У выпадку адсутнасці грошай адзенне можна будзе набыць у крэдыт.

На думку міністра юстыцыі Літвы Йонаса Прапестыса, які прадставіў праект пастановы, эксперымент дасць магчымасць зэканоміць нямала дзяржаўных сродкаў, бо толькі ў трох вышэйпералічаных папраўчых установах утрымліваецца каля пяці тысяч зняволеных, а спецадзенне для кожнага з іх каштуе каля ста літаў.

Аднак важнейшая перавага новага парадку — магчымасць гуманных адносін да асуджаных, адзначыў міністр.

ЭЛЬТА — БЕЛІНФАРМ.

ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

УСЕ СТУДЭНТЫ — У ПОЛЬШЧУ

На падставе дагавора, падпісанага Беларускім саюзам прадпрымальнікаў і Варшаўскім інстытутам усходніх даследаванняў, частка студэнтаў недзяржаўнай Акадэміі парламентарызму і прадпрымальніцтва, а таксама Інстытута кіравання і прадпрымальніцтва выехала ў Польшчу. Гэта першая група беларускіх студэнтаў недзяржаўных ВНУ, якія пройдуць практыку ў буйных вытворчых фірмах і будаўнічых арганізацыях гэтай краіны з 10 па 29 ліпеня.

У перспектыве на вучобу ў Польшчу будуць адпраўлены ўсе студэнты. Расходы па іх навучанню ўзяў на сябе польскі бок.

ТЭРЭЗА ХАЮЦІНА, Белінфарм.

ПИСЬМО ПРОВЕРИЛ КОРРЕСПОНДЕНТ

И В ТЕСНОТЕ, И В ОБИДЕ,

или ПОДРОБНЕЕ О ТОМ, КАК ЖИВУТ ЛЮДИ В ДОМЕ № 9, К.1 ПО УЛ.ФИЛИМОНОВА

Николай БРИКС «ДВ».

«Уважаемая редакция! К вам обращаются жильцы дома № 9, корпус 1 по улице Филимонова. Мы уже полтора года боремся за свои права жить в нормальных человеческих условиях. Куда только ни обращались: и в Партизанский райисполком, и в АП «Стройтрест № 1», которому принадлежит дом, в другие инстанции. Отовсюду приходит практически один и тот же ответ : на реконструкцию дома нет средств. Вот и вновь пришел документ из АП «Стройтрест № 1», в котором — уже знакомое: об отсутствии средств. И оговаривается, что в случае, если они появятся, будет проведен всего лишь поддерживающий ремонт. Но о каком ремонте можно говорить, если стены, потолки протекают, полы да и многое другое подгнило. Ко всем «радостям» бытия еще услышали, что будет снесен во дворе ближайший туалет, а дальний — за 500 метров... Такое впечатление, что с нами совсем не считаются. Очень просим нам помочь.

Жильцы дома — всего 6 подписей».

...В этой квартире хорошо только попугайчику, оптимальное жизненное пространство которого свелось к размерам маленькой клетки. Во время нашего разговора он беззаботно напевал свою незатейливую песенку. Хозяйке же квартиры Тамаре Судник было явно не до песен. Чуть не плача, она рассказывала о житье-бытье своей семьи. Сладким его никак не назовешь. Кроме хозяйки в одной-единственной комнате сейчас живут (а получили они квартиру еще в 1979 году) ее муж, 19-летняя дочь, 17-летний сын. Положение в некоторой степени спасает то, что в этой небольшой комнате самодельной перегородкой отгорожена спаленка. В основной комнате — только повернуться — все заставлено мебелью. Такое же впечатление остается и от очень тесной кухни, в которой и двум человекам трудно разминуться. Ну а горячей воды, вентиляции, ванной комнаты, туалета, подвала вообще нет. Словом, квартира со всеми неудобствами. В туалет приходится ходить во двор за несколько десятков метров. Да и тот под угрозой сноса. Рядом с ним (метрах в пяти) построен новый многоэтажный дом, и его жильцы ждут не дождутся, когда из-под их окон уберут это отнюдь не ласкающее глаз сооружение.

Если бы в таких чрезвычайно стесненных условиях ютилась в этом небольшом 2-этажном доме только семья Судник, так это было бы еще полбеды. Но здесь точно так же ютятся 40 семей. Мы без выбора зашли в несколько других квартир. Ничего хорошего, конечно, в них не увидели. Во многих комнатах подгнили полы, отсырели стены, в черных подтеках верхние углы, осыпается штукатурка, хозяев одолевают мыши и тараканы, почти везде стоит тяжелый воздух — процесс гниения, повышенная влажность, отсутствие хорошей вентиляции делают свое дело... И в то же время в квартире № 20 мы услышали, что за такое «комфортабельное» жилье приходится платить втридорога. Например, за май семья Леонида Шамко получила счет за жилье на 62 тысячи рублей (это без оплаты отопления, электричества и телефона).

Не думаю, что этим живописанием квартирных мук жильцов открою глаза руководству Партизанского райисполкома, АП «Стройтрест № 1». Судя по, увы, бесплодной переписке жильцов дома с ними, вижу, что и в райисполкоме, и в тресте прекрасно осведомлены о жилищных бедах 40 семей. Там без споров признают, что дом нуждается в коренной реконструкции с обеспечением всех коммунальных удобств. Однако все упирается в нехватку средств, отсутствие подменного жилого фонда, куда можно было бы переселить 40 семей на время обновления их дома. Ах, как прекрасно в свое время началась реконструкция этого небольшого квартала 2-этажных старых домов в районе улицы Филимонова. Повезло, например, жильцам дома № 5, корпус 2. Дом существенно обновили, надстроили третий этаж, добавили лоджии и все прочие коммунальные удобства. Люди стали жить в нормальных благоустроенных квартирах. Правда, есть жалобы на качество строительных работ: бывает, что в дом протекает дождевая вода. Но, несмотря на это, думаю, никто из них не пожелал бы оказаться вновь в старом полусгнившем доме. Еще больше повезло жильцам дома № 5, корпус 1. Там и вовсе старый дом был существенно перестроен, дополнен «вставками» — только живи в нем и радуйся. Очевидно, на очереди была реконструкция и дома № 9, корпус 1, но у треста, которому принадлежат эти здания, иссякли финансовые возможности. Как здесь не понять горечь досады жителей дома-неудачника! А у треста и на поддерживающий ремонт денег нет.

Как рассказывал мне зам. управляющего трестом Михаил Васильевич Космич, с реконструкцией этого дома (до этого удалось обновить 3 дома) трест остался один на один со своими проблемами. Учитывая, что в нем проживает только 50% трестовских работников, пытались организовать ремонт в складчину: обратились за помощью к организациям и предприятиям, где трудятся остальные жильцы дома, но получили отказ. Обращался трест за помощью и в Партизанский райисполком, и в горисполком. Но безрезультатно. Между тем, на реконструкцию дома надо 3 млрд. рублей (это около 0,3 млн. долларов). Кроме того, проблема усложняется необходимостью отселения на время реконструкции 40 семей. Пробовали в тресте решить проблему с помощью коммерческих структур. Но охотников не нашлось. Дальше осмотра дома, места его расположения дело не пошло. Во-первых, место не Бог весть каких достоинств, во-вторых, очень уж сильно отпугивает необходимость предоставления его жильцам 40 квартир — это по самым малым прикидкам потребует 0,6-1 млн. долларов. Единственное, чем может утешить жильцов Михаил Васильевич, так только тем, что изысканы средства на ремонт кровли дома. Пока это все. Нет денег даже на косметический ремонт мест общего пользования. Такие вот дела. И почти никаких перспектив на новые квартиры. **Сейчас в очереди на жилье в тресте (а она тянется с 1976 года) стоит 1200 человек. В прошлом году выделено всего лишь 26 квартир...**

А кроме этого дома у треста в точно таком же положении еще 4. Он готов взяться за их реконструкцию хоть сейчас — были бы только деньги. Вот только где их взять?

